## МАРФЕМНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ ПРОЗВІШЧАЎ ЗЭЛЬВЕНШЧЫНЫ

*К. А. Барысевіч*
Навуковы кіраўнік – д.філал.н., прафесар *П. У. Сяцко*
*Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы*

У працы аналізуюцца прозвішчы Зэльвенскага раёна, іх утварэнне і структурна-тыпалагічныя асаблівасці. Задача даследавання – выдзяленне асноўных прозвішчных тыпаў і антрапафармантаў, выяўленне ступені іх прадукцыйнасці. У выніку аналізу выразна вылучаюцца тры асноўныя спосабы утварэння прозвішчаў: марфемны (суфіксацыя), семантычны і канверсія.

Марфемная дэрывацыя найбольш прадукцыйная у антрапаніміконе Зэльвеншчыны (57%). Дэрываты прадстаўлены дзесяццю прозвішчнымі тыпамі, сярод якіх шэсць агульнаславянскіх, два ўсходнеславянскія, адзін унутрымоўны.

Асноўную ролю ў сістэме прозвішчаў, утвораных суфіксацыяй, іграюць агульнаславянскія тыпы на *–овіч/-евіч*, *-іч/-ыч/-ыц* (28,5%), а таксама на *–скі/-оўскі/-еўскі*, *-інскі*, *-цкі/-іцкі/-ецкі* (26%) і на *–ік/-ык*, *-чык* (19%). Прадукцыйнасць першых двух тыпаў перавышае агульнабеларускі паказчык прыкладна ў тры разы. Тып жа *–ік/-ык, -чык* пераўзыходзіць яго амаль у чатырнаццаць разоў, што можна патлумачыць двайной матывацыяй такіх прозвішчаў : яны могуць кваліфікавацца як семантычныя ўтварэнні. Зафіксаваны на Зэльвеншчыне агульнаславянскі тып *–ак/-як* (3%). Статыстычныя паказчыкі па Беларусі адсутнічаюць, што адлюстроўвае, відаць, выключна спарадычнае ўжыванне прозвішчаў з такім фармантам. Наяўнасць жа іх на даследаванай тэрыторыі можна патлумачыць уплывам заходняй культуры праз польскую мову, што выклікана разнастайнымі экстралінгвістычнымі фактарамі.

Удзельная вага антрапонімаў, якія належаць усходнеславянскім і ўласна беларускім тыпам, невялікая – адпаведна 13.5% і 2 %. Частотнасцю вылучаецца толькі ўсходнеславянскі тып на *–ук/-юк, -чук* (12%). Прадукцыйнасць яго на беларускай этнамоўнай тэрыторыі складае прыкладна 3%.. З унутрымоўных тыпаў ў антрапаніміконе Зэльвеншчыны зафіксаваны нешматлікія прозвішчы на *–еня/-эня*, уласцівыя беларусккай мове. Колькасць іх перавышае агульнабеларускі паказчык у два разы.

Асноўная большасць прозвішчаўтваральных фармантаў мае патранімічны або матранімічны характар. Вылучаюцца антрапонімы з фармантамі, якія першапачаткова належалі дэмінутыўным або атрыбутыўным формам, а патранімічнае значэнне набылі толькі падчас прозвішчаўтварэння.

Сярод прозвішчаўтваральных асноў марфемных дэрыватаў асноўнае месца належыць назоўнікам апелятыўнага паходжання, значнае месца – уласным асабовым мужчынскім і, радзей, жаночым імёнам, нязначнае – апелятывам-прыметнікам. Невялікую групу складаюць антрапонімы, у якіх фармант далучаны да тапонімаў. Нярэдка прозвішчаўтваральныя асновы – гэта суфіксальныя дэрываты (14%).

Такім чынам, суфіксацыя – найбольш прадукцыйны спосаб утварэння беларускіх прозвішчаў. У межах Зэльвенскага раёна такім шляхам былі ўтвораныя 57% антрапонімаў. Паводле ўдзелу фармантаў у дэрывацыі выдзяляецца дзесяць прозвішчных тыпаў. Некаторыя фарманты (*-ак/-як*, *-ік/-ык*, *-чык*, *-ук/-юк*, *-чук*) прымаюць удзел не толькі ва ўтварэнні прозвішчаў, але і ў апелятыўнай дыялектнай дэрывацыі, што выклікае дадатковыя цяжкасці пры класіфікацыі антрапонімаў паводле шляхоў іх утварэння.

## ИЗМЕНЕНИЕ СТРУКТУРЫ ПРЕДЛОЖЕНИЯ В СРЕДНЕАНГЛИЙСКИЙ ПЕРИОД

*А. Г. Ольшевская*
Научный руководитель – к.филол.н., доцент *Л. М. Середа*
*Гродненский государственный университет имени Янки Купалы*

Изучение структуры предложения проводилось нами на основе обработки целых текстов 11 памятников письменности среднеанглийского периода с XI-го по XV века, что позволило обнаружить типичные черты построения синтаксических конструкций в среднеанглийский пе-